Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 24. Варыянт 7. Ч.3**

## Білет 24. Практычнае заданне. Гаспадарчае жыццё беларускіх зямель у IX - XIII стст. Шляхі ўзнікнення гарадоў, іх роля

**Заданні склалі:**Руцкая Л.А., ДУА "Сярэдняя школа № 148 г. Мінска"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**
1. Карыстаючыся картасхемай, назавіце і пакажыце беларускія гарады, якія ўзніклі ў XII ст.
2. Растлумачце, што ўяўлялі сабой часткі сярэднявечнага горада.
3. Абапіраючыся на схему, прывядзіце прыклады назваў беларускіх гарадоў. Зрабіце на аснове гэтага вывад аб паходжанні іх назваў.
4. Дакажыце, на падставе прыведзеных крыніц, што сучасныя беларускія гарады адрозніваюцца ад сярэднявечных.

**Крыніца I**
**З навучальнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі", 6 клас, ч.1**

На беларускіх землях у Сярэднявеччы ўсе гарады былі драўлянымі. З дрэва будавалі ўмацаванні, дамы, масцілі ім вуліцы. Толькі зрэдку ў гарадах сустракаліся будынкі з каменя і цэглы. У асноўным гэта былі цэрквы. Галоўная царква горада звалася саборам. Частка горада, дзе знаходзіўся княскі палац (церам) і дамы дружыннікаў (грыдніцы), магла быць добра ўмацаванай. Такі абароненываламі, равамі, і сценамі цэнтр старажытнага горада зваўся дзяцінец. Вакол дзядзінца размяшчаліся дамы рамеснікаў і гандляроў. Гэтае неўмацаванае селішча звалася "пасад".

**Крыніца II**
**Схема "Паходжанне назваў беларускіх гарадоў"**




**Крыніца III**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

